**© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

## РТ–2025/2026 гг. Этап II

## Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

## Варыянт 1

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А (16 *заданняў) і часткі* В (22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

## Частка А

*У кожным заданні часткі* А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі пачаўся:**
1) 100 тыс. гадоў таму;
2) у 24-м тыс. да н. э.;
3) у 12-м тыс. да н. э.;
4) у 3-м тыс. да н. э.;
5) у 2-м тыс. да н. э.

**А2. Тып дзяржаўнага ўладкавання, пры якім на чале краіны стаіць рэлігійны лідар, – гэта:**
1) дэспатыя;
2) імперыя;
3) манархія;
4) тэакратыя;
5) рэспубліка.

**А3. Вызначце характэрную рысу развіцця культуры на беларускіх землях у IX–XIII стст.:**
1) з'яўленне рукапісных кніг;
2) распаўсюджванне стылю рэнесанс;
3) з'яўленне гравюры;
4) з'яўленне кнігадрукавання;
5) стварэнне калегіумаў.

**А4. Вызначце правільнае сцверджанне адносна палітычнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у Познім сярэднявеччы.**
1) Першыя рэспублікі з'явіліся ў Англіі.
2) У дзяржавах Заходняй Еўропы ўсталяваўся палітычны лад на візантыйскі ўзор.
3) Сойм з'яўляўся саслоўна-прадстаўнічым органам у Кастыліі (Іспанія).
4) Узмацнілася феадальная раздробленасць.
5) Генеральныя штаты ў Францыі складаліся з трох палат.

**А5. Адзначце падзею, якая адбылася ў 1253 г.:**
1) заключэнне Крэўскай уніі;
2) бітва пад Оршай;
3) бітва на р. Ворскле;
4) каранацыя Міндоўга;
5) бітва на р. Сінія Воды.

**А6. Паводле Люблінскай уніі агульным(-ай) для Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Польшчы ў складзе Рэчы Паспалітай быў (было; была):**

1) сойм;
2) заканадаўства;
3) дзяржаўная пячатка;
4) судовая сістэма;
5) дзяржаўны апарат кіравання.

**А7. Феадальная гаспадарка ў ВКЛ, заснаваная на працы залежных сялян і арыентаваная на выраб збожжа на продаж, атрымала назву:**

1) дым;
2) інвентар;
3) валока;
4) фальварак;
5) натуральная.

**А8. Дзейнасць М. Лютэра прывяла да:**

1) пачатку прамысловай рэвалюцыі ў Англіі;
2) заключэння Альтмаркскага перамір’я;
3) пачатку Рэфармацыі ў Германіі;
4) заключэння Фларэнтыйскай уніі;
5) заканчэння Стогадовай вайны.

**А9. На Венскім кангрэсе ў 1815 г. быў (была; былі; было):**

1) прыняты «Біль аб правах» у Англіі;
2) усталявана Другая рэспубліка ў Францыі;
3) падведзены вынікі напалеонаўскіх войнаў;
4) утворана Вялікае Герцагства Варшаўскае;
5) абвешчана Германская імперыя.

**А10. Дзяржаўныя сяляне, якія атрымалі асабістую свабоду ў выніку рэформы П. Д. Кісялёва, называліся:**

1) смерды;
2) «вольныя вясковыя абывацелі»;
3) чэлядзь;
4) прыгонныя;
5) даннікі.

**А11. Адной з задач сталыпінскай аграрнай рэформы была(-о):**

1) адмена часоваабавязанага становішча сялян;
2) увядзенне выкупных плацяжоў;
3) спыненне арэнды дзяржаўных зямель;
4) правядзенне палітыкі «апякунства» над сялянамі;
5) ліквідацыя сялянскага абшчыннага землекарыстання і землеўладання.

**А12. Устанавіце адпаведнасць.**

| Эканамічная палітыка | Мерапрыемствы |
|---|---|
| 1) палітыка «ваеннага камунізму»<br>2) новая эканамічная палітыка (НЭП) | а) замена харчразвёрсткі харчпадаткам<br>б) увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці<br>в) частковая прыватызацыя сярэдніх і дробных прадпрыемстваў<br>г) прыцягненне замежнага капіталу<br>д) нацыяналізацыя прамысловасці<br>е) натуралізацыя і ўраўняльнасць у заробках |

1) 1авг; 2бде;
2) 1бде; 2авг;
3) 1аге; 2бвд;
4) 1вгд; 2абе;
5) 1бвг; 2аде.

**А13. Адна з буйнейшых танкавых бітваў Вялікай Айчыннай вайны, вядомая як «Лепельскі контрудар», пачалася:**

1) 22 чэрвеня 1941 г.;
2) 25 чэрвеня 1941 г.;
3) 28 чэрвеня 1941 г.;
4) 6 ліпеня 1941 г.;
5) 11 ліпеня 1941 г.

**А14. У другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. у БССР вядучай галіной прамысловасці становіцца:**

1) дрэваапрацоўчая прамысловасць;
2) харчовая прамысловасць;
3) машынабудаванне;
4) нафтавая прамысловасць;
5) металургія.

**А15. Упершыню Усебеларускі народны сход быў скліканы ў:**

1) 1995 г.;
2) 1996 г.;
3) 1997 г.;
4) 1999 г.;
5) 2001 г.

**А16. Вызначце дзяржаву, якая паспяхова змагла супрацьстаяць «каляровым рэвалюцыям»:**

1) Кітай;
2) Сірыя;
3) Егіпет;
4) Грузія;
5) Кыргызстан.

## Частка В

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

**В1. Устанавіце адпаведнасць.**

| Этап развіцця першабытнага грамадства | Характарыстыка |
|---|---|
| А) праабшчына<br>Б) радавая абшчына<br>В) суседская абшчына | 1) дзяленне членаў абшчыны на саслоўі<br>2) складалася з 20–30 чалавек, мела няўстойлівы склад<br>3) існавала прыватная ўласнасць на пашы, зямлю<br>4) спалучэнне індывідуальнага і калектыўнага землекарыстання<br>5) галоўная прыкмета – кроўная сувязь усіх членаў абшчыны |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б5В3.**

**B2. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная падзея | Дата |
|---|---|
| А) бітва на р. Нямізе паміж войскамі Усяслава Брачыславіча і князёў Яраслававічаў<br>Б) абвяшчэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі<br>В) атрыманне Карлам Вялікім імператарскай кароны<br>Г) заснаванне епархіі ў Полацку | 1) 800 г.<br>2) 962 г.<br>3) 992 г.<br>4) 1005 г.<br>5) 1067 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**B3. Вызначце правільныя сцверджанні адносна распаўсюджвання хрысціянства на тэрыторыі Беларусі ў X–XIII стст.**

1) Самым вядомым на беларускіх землях стаў Сафійскі сабор, узведзены пры Ефрасінні Полацкай у 1120-я гг.
2) Хрысціянства спрыяла з'яўленню фрэскавага жывапісу.
3) У штодзённым жыцці насельніцтва беларускіх зямель адбылося перапляценне хрысціянства і традыцыйных народных вераванняў.
4) На тэрыторыі Беларусі хрысціянізацыя першапачаткова ахапіла насельніцтва вёсак.
5) Хрысціянства спрыяла распаўсюджванню глаголіцы сярод насельніцтва.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**B4.** У Заходняй Еўропе прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і выкарыстанні ручной працы наёмных рабочых, – **гэта __________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B5. Вызначце характэрныя рысы духоўнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у перыяд Позняга сярэднявечча:**

1) самай магутнай арганізацыяй у Заходняй Еўропе была каталіцкая царква;
2) разгарнуўся рэфармацыйны рух;
3) ва Усходняй Еўропе насельніцтва пераважна вызнавала праваслаўе;
4) былі арганізаваны крыжовыя паходы;
5) была зроблена спроба заключэння царкоўнай уніі.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B6. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця ВКЛ у XIV–XV стст.:**

1) пачатак працэсу запрыгоньвання сялян;
2) увядзенне адзінай мытнай пошліны;
3) наданне гарадам магдэбургскага права;
4) перавага царкоўнага землеўладання;
5) рост феадальнага землеўладання.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B7. Устанавіце паслядоўнасць падзей.**
1) Заключэнне Вестфальскага міру;
2) падпісанне Востраўскага пагаднення паміж Вітаўтам і Ягайлам;
3) пачатак буржуазнай рэвалюцыі ў Францыі;
4) падзенне Візантыйскай імперыі;
5) прыняцце I Статута ВКЛ.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* 12345.**

**B8.** Форма праўлення ў Заходняй Еўропе, пры якой манарху належыць неабмежаваная ўлада, – **гэта __________ (неабмежаваная) манархія**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B9. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Гістарычная падзея |
|---|---|
| А) Стэфан Баторый<br>Б) Брачыслаў Ізяслававіч<br>В) Жыгімонт II Аўгуст<br>Г) Віцень | 1) канчатковае ўключэнне Полацкай зямлі ў склад ВКЛ<br>2) заключэнне Люблінскай уніі<br>3) паражэнне ў бітве пад Вількамірам<br>4) пацвярджэнне самастойнасці ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай<br>5) паход на Ноўгарад у 1021 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**B10. Вызначце правільныя сцверджанні адносна Контррэфармацыі ў ВКЛ.**
1) Адным з вынікаў Контррэфармацыі стала звужэнне свабоды веравызнання.
2) Спрыяла ўмацаванню верацярпімасці ў грамадстве.
3) Контррэфармацыя прывяла да шматлікіх рэлігійных войнаў у ВКЛ.
4) Галоўнымі праваднікамі Контррэфармацыі сталі пратэстанты.
5) Контррэфармацыя ў ВКЛ мела больш мяккія формы ў параўнанні з Заходняй Еўропай.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**B11. Для сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у XVIII ст. былі характэрны:**
1) пачатак фарміравання капіталістычных адносін;
2) з’яўленне сіндыкатаў;
3) будаўніцтва рачных каналаў;
4) будаўніцтва чыгунак;
5) правядзенне эканамічных рэформ.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В12. Устанавіце адпаведнасць.**

| Характарыстыка | Гістарычная асоба |
|---|---|
| А) вынаходнік электрарухавіка<br>Б) запатэнтаваў паравы рухавік «двайнога дзеяння»<br>В) венецыянец, які здзейсніў шматгадовае падарожжа ў Кітай і Цэнтральную Азію, аўтар «Кнігі аб разнастайнасці свету»<br>Г) вучоны-прыродазнаўца, дырэктар Віленскай абсерваторыі, заснаванай у 1753 г., рэктар Галоўнай школы ВКЛ | 1) Марка Пола<br>2) Марцін Пачобут-Адляніцкі<br>3) Мікалай Радзівіл Чорны<br>4) Майкл Фарадэй<br>5) Джэймс Уат |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В13. Вызначце тэндэнцыі гістарычнага развіцця ў XIX ст.:**
1) адсутнасць мадэрнізацыі ў краінах Усходу;
2) замацаванне феадальных парадкаў у краінах Усходняй Еўропы;
3) узмацненне ўплыву заходняй цывілізацыі на свет;
4) узмацненне каланіяльнай экспансіі еўрапейскіх дзяржаў;
5) узмацненне нераўнамернасці развіцця асобных дзяржаў.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**В14. Адзначце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *першай* сярод пералічаных:**
1) завяршэнне аб’яднання Германіі;
2) правядзенне Полацкага царкоўнага сабору;
3) стварэнне Свяшчэннага саюза;
4) адкрыццё першай чыгуначнай лініі на тэрыторыі Беларусі;
5) утварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП).

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**В15.** У перыяд сталыпінскай аграрнай рэформы адасоблены ўчастак зямлі, на які пераносілася сядзіба селяніна, а таксама сельскагаспадарчы інвентар, неабходны для апрацоўкі зямлі, – **гэта __________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В16.** Нацыянальная партыя (Гаміньдан) была створана ў Кітаі Сунь Ятсенам **у _____ годзе**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**В17. Выкарыстоўваючы картасхему, вызначце правільныя сцверджанні адносна фарміравання тэрыторыі БССР.**




1) Заходняя Беларусь увайшла ў склад БССР пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавора.
2) Тэрыторыя БССР канчаткова аформілася па выніках Рыжскага мірнага дагавора.
3) Частка тэрыторыі была перададзена са складу РСФСР у склад БССР у 1926 г.
4) Заштрыхаваная на картасхеме тэрыторыя БССР сфарміравалася ў 1921 г.
5) «Лінія Керзана» праходзіла па граніцы СССР у 1921 г.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**В18.** Палітычны рэжым, пры якім улада канцэнтруецца ў руках аднаго чалавека або групы асоб; насельніцтва пазбаўлена права ажыццяўляць кантроль за прыняццем і выкананнем палітычных рашэнняў; які быў усталяваны ў 1920-я гг. у Балгарыі, Іспаніі, Польшчы, Югаславіі, Румыніі, – **гэта __________ рэжым**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В19. Вызначце правільныя сцверджанні адносна палітычнага развіцця БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.**

1) Асаблівасцю была барацьба з нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў заходніх абласцях рэспублікі.
2) У БССР аформіўся апазіцыйны Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) грамадска-палітычны рух – Беларускі народны фронт (БНФ).
3) Адбывалася назначэнне на кіруючыя пасады ў БССР былых камандзіраў партызанскага руху.
4) Дзяржаўная канфесійная палітыка ў БССР стала больш цярпімай.
5) Камуністычная партыя была абвешчана кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В20.** Дэкларацыя «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» была прынята **ў _____ годзе**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* 1900.**

**В21. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў другой палове XX – першай чвэрці XXI ст.**

1) Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС);
2) падпісанне ў Хельсінкі Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ);
3) прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа»;
4) абвяшчэнне яўрэйскім насельніцтвам Палесціны дзяржавы Ізраіль;
5) выбранне М. С. Гарбачова Прэзідэнтам СССР.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* 12345.**

**В22. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная падзея | Дата |
|---|---|
| А) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі | 1) 1992 г. |
| Б) устанаўленне дыпламатычных адносін суверэнных дзяржаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі | 2) 1996 г. |
| В) падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі | 3) 1999 г. |
| Г) Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай – партнёрам БРІКС | 4) 2010 г. |
| | 5) 2024 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**